Міхайлава В., студ гр. 205
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Міцкевіч А.Г.,
ст. выкладчык

## УСПАЎНЕННЕ СТРАТ НА АРХЕАЛАГІЧНЫМ КАЛЯРОВЫМ МЕТАЛЕ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да ўпрыгожванняў рук адносяцца пярсценкі, браслеты. Іх насілі і жанчыны і мужчыны на правай і левай руцэ. Выраблялісія з медзі, бронзы, волава, срэбра, бурштына, золата. Былі распаўсюджаны драцяныя, пласцінчатыя і шырокасярэдзінныя пярсценкі.

Пярсценкі трапілі на рэстаўрацыю ў колькасці 5 штук са стратамі камянеў і фрагментаў з калекцыі музея гісторыі Мінска. На пярсценках з каразійнай злаякаснай пацінай было вырашана выкарыстаць ачыстку з выкарыстаннем трылона Б і рэстаўрацыйнага састава для ачысткі каляровага металу на аснове комплексных солей вытворчасці айчыннага прадпрыемства “Хіммедсінтэз” На прадметах з наяўнасцю шляхетнай паціны выдаленне апошняй не патрабавалася. Ачыстка ад паверхневых забруджанняў праводзілася з выкарыстаннем этылавага спірту і ватных палачак.

Адным з найбольш распаўсюджаных пашкоджанняў археалагічных пярсценкаў з’яўляюцца фрагментарныя страты і вельмі стончаны метал. У дадзенай сітуацыі выкарыстанне пайкі абсалютна непажадана, у тым ліку з пункту гледжання недатыкальнасці арыгінала. Было вырашана скарыстаць вопыт рэстаўратараў з Варшаўскага археалагічнага музея, якія ўспаўненні страт на археалагічным метале праводзяць з выкарыстаннем эпаксідных смолаў, у прыватнасці Эпідыяна для адлівак з наступнай таніроўкай ці з даданнем у адлівачную масу металічнай пудры адпаведна падабранага адцення. Выкарыстанне дадзенага тыпу ўспаўненняў больш поўна адказвае

патрабаванням абарачальнасці і дазваляе пазбегнуць нераўнамернага нагрэву прадмета.

З-за адсутнасці якасных злепачных матэрыялаў методыка была мадыфікавана наступным чынам: заміж вадкацякучага эпідыяну было вырашана выкарыстоўваць матэрыял вытворчасці ЗША (так званая “халодная зварка”). Гэты матэрыял дае магчымасць працаваць ў тэхніцы прамога нарошчвання, даволі легка апрацоўваецца, мае дастатковую трываласць і прычэпнасць для такога тыпу ўспаўненняў як тонкія дужкі пярсценкаў з малой плошчай сутыкнення арыгінала і рэстаўрацыйнага матэрыяла. Да дадатнага можна аднесці і добрую таніруемасць успаўненняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ